ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
11 чэрвеня 2011 г. № 759

# Аб Падзяцы Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь

Изменения и дополнения:

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 28 ноября 2014 г. № 1111 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 03.12.2014, 5/39758) <C21401111>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 24 июня 2017 г. № 471 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 28.06.2017, 5/43870) <C21700471>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 13 мая 2022 г. № 295 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 15.05.2022, 5/50238) <C22200295>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 4 июля 2022 г. № 444 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 06.07.2022, 5/50448) <C22200444>

У мэтах удасканальвання мер стымулявання працоўнай дзейнасці Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць:

Палажэнне аб аб’яўленні Падзякі Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца);

апісанне спецыяльнага ліста аб аб’яўленні Падзякі Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца).

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з дня яе афіцыйнага апублікавання.

**Прэм’ер-міністр Рэспублікі Беларусь** **М.Мясніковіч**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
11.06.2011 № 759

## ПАЛАЖЭННЕ
## аб аб’яўленні Падзякі Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь

1. Дадзеным Палажэннем устанаўліваецца парадак прадстаўлення грамадзян Рэспублікі Беларусь, калектываў арганізацый да аб’яўлення Падзякі Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь (далей – Падзяка).

2. Падзяка грамадзянам Рэспублікі Беларусь, калектывам арганізацый аб’яўляецца за:

шматгадовую і бездакорную працу, паспяховае і добрасумленнае выкананне працоўных абавязкаў, іншыя дасягненні ў рабоце;

выкананне заданняў асаблівай важнасці і складанасці;

дасягненні ў навуцы, гаспадарчым, сацыяльна-эканамічным развіцці.

3. Падзяка грамадзянам Рэспублікі Беларусь, калектывам арганізацый аб’яўляецца па ініцыятыве Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь, па прапановах членаў Урада Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, дзяржаўных органаў, грамадскіх аб’яднанняў.

4. Хадайніцтвы аб аб’яўленні Падзякі грамадзянам Рэспублікі Беларусь узбуджаюцца па месцы працы (службы) грамадзян з улікам звестак аб грамадзянах, атрыманых у тым ліку з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях у парадку, прадугледжаным заканадаўствам, і накіроўваюцца ў адпаведныя рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Савету Міністраў Рэспублікі

Беларусь, абласныя (Мінскі гарадскі) выканаўчыя камітэты, дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, а затым уносяцца для разгляду Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь.

5. Хадайніцтвы аб аб'яўленні Падзякі калектывам арганізацый узбуджаюцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, або іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, або абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі, або дзяржаўнымі органамі, або грамадскімі аб'яднаннямі і ўносяцца для разгляду Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь.

6. Хадайніцтвы аб аб'яўленні Падзякі, якія ўносяцца Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь, павінны ўключаць:

для аб'яўлення Падзякі грамадзяніну Рэспублікі Беларусь – прадстаўленне згодна з дадаткам 1 і даведку-аб'ектыўку, падпісаную кіраўніком арганізацыі, у якой узбуджаецца хадайніцтва аб аб'яўленні Падзякі, звесткі з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях аб здзейсненых асобай правапарушэннях ці іх адсутнасці;

для аб'яўлення Падзякі калектыву арганізацыі – прадстаўленне згодна з дадаткам 2 і даведку аб асноўных паказчыках работы арганізацыі за апошні год работы і справаздачны перыяд бягучага года на дату прадстаўлення да аб'яўлення Падзякі, падпісаную кіраўніком арганізацыі.

7. Падзяка аб'яўляецца распараджэннем Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі падпісвае Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь. На подпіс ставіцца адбітак пячаткі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з відарысам Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

Грамадзяніну Рэспублікі Беларусь уручаецца спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі і грашовае ўзнагароджанне ў памеры да 10 базавых велічынь. Выплата ажыццяўляецца за кошт сродкаў арганізацыі, у якой працуе (служыць) грамадзянін, прадстаўлены да аб'яўлення Падзякі.

Калектыву арганізацыі ўручаецца толькі спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі.

8. Спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі і грашовае ўзнагароджанне ўручаюцца Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь ці па яго даручэнню:

намеснікамі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь;

кіраўнікамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання;

старшынямі абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў;

іншымі службовымі асобамі.

9. Спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі і грашовае ўзнагароджанне ўручаюцца асабіста грамадзяніну Рэспублікі Беларусь пры ўрачыстых абставінах, а спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі калектыву арганізацыі – на ўрачыстым сходзе ці пасяджэнні гэтага калектыву не пазней як праз месяц з дня падпісання Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь распараджэння аб аб'яўленні Падзякі.

Дадатак 1
да Палажэння аб аб’яўленні
Падзякі Прэм’ер-міністра
Рэспублікі Беларусь

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) ________________________
2. Пасада, месца працы (службы) ________________________________________________
_____________________________________________________________________________
3. Чысло, месяц і год нараджэння ________________________________________________
4. Адукацыя ___________________________________________________________________
5. Ці аб’яўлялася раней Падзяка Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь і дата аб’яўлення
_____________________________________________________________________________
6. Месца жыхарства або знаходжання і тэлефон ____________________________________
_____________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________
7. Агульны стаж работы (службы) ________________________________________________
Стаж работы (службы) у дадзеным калектыве ______________________________________
8. Заслугі, за якія прадстаўляецца да аб’яўлення Падзякі Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь ________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________

Член Урада Рэспублікі Беларусь, кіраўнік
дзяржаўнай арганізацыі, падпарадкаванай Савету
Міністраў Рэспублікі Беларусь, старшыня абласнога
(Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта,
кіраўнік дзяржаўнага органа, упаўнаважаны
прадстаўнік грамадскага аб’яднання ________________________________

(подпіс, ініцыялы (ініцыял уласнага імя), прозвішча)

М.П.*

__ _______________ ____ г.

______________________

* Пры яе наяўнасці.

Дадатак 2
да Палажэння аб аб’яўленні
Падзякі Прэм’ер-міністра
Рэспублікі Беларусь

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**

1. Назва арганізацыі ____________________________________________________________
_____________________________________________________________________________
2. Месца знаходжання і тэлефон _________________________________________________
_____________________________________________________________________________
3. Ці аб’яўлялася раней Падзяка Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь і дата аб’яўлення
_____________________________________________________________________________
4. Заслугі, за якія прадстаўляецца да аб’яўлення Падзякі Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь ________________________________________________________________________
_____________________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

Член Урада Рэспублікі Беларусь, кіраўнік
дзяржаўнай арганізацыі, падпарадкаванай Савету
Міністраў Рэспублікі Беларусь, старшыня абласнога
(Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта,
кіраўнік дзяржаўнага органа, упаўнаважаны
прадстаўнік грамадскага аб’яднання

______________________________
(подпіс, ініцыялы (ініцыял уласнага імя), прозвішча)

М.П.*

__ _______________ ____ г.

______________________

* Пры яе наяўнасці.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
11.06.2011 № 759
(у рэдакцыі пастановы
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
13.05.2022 № 295)

**АПІСАННЕ**
**спецыяльнага ліста аб аб'яўленні Падзякі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь**

1. Спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (далей – Падзяка) уяўляе сабой папяровы ліст белага колеру шчыльнасцю 280 г/кв. м памерам 297 х 210 мм.

2. Па знешняму краю Падзякі размешчана паласа шырынёй 8 мм у выглядзе беларускага арнаменту шэрага колеру са знешнім перыметрам 282 х 196 мм і ўнутраным – 265 х 179 мм.

3. На Падзяцы ў цэнтры верхняй часткі на адлегласці 18 мм ад знешняга краю знаходзіцца Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь памерам 25 х 25 мм.

4. Ніжэй відарыса Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь на адлегласці 4 мм размешчаны надпіс шэрага колеру ў тры радкі «ПАДЗЯКА ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ». Вышыня літар – 13 мм (слова «ПАДЗЯКА»), 5 мм (словы «ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА» і «РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ»).

5. На адлегласці 28 мм ад радка са словамі «РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» размяшчаецца тэкст аб узнагароджанні, які наносіцца друкарскім спосабам (вышыня літар – 3 мм). Ніжэй на адлегласці 10 мм друкарскім спосабам указваюцца ў два радкі прозвішча асобы, якой аб'яўляецца Падзяка (вышыня літар – 6 мм), уласнае імя і імя па бацьку (калі такое маецца) (вышыня літар – 4 мм).

6. У ніжняй трэці часткі Падзякі на адлегласці 30 мм ад ніжняга краю знаходзіцца выява Дома Урада на фоне светла-блакітнага колеру.

7. У ніжняй частцы Падзякі з левага боку літарамі шэрага колеру ў два радкі размешчаны словы «Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь» (вышыня літар – 2 мм), з правага боку – друкарскім спосабам ініцыялы і прозвішча Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (вышыня літар – 2 мм).

8. З левага боку пад словамі «Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь» друкарскім спосабам указваецца дата распараджэння Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь аб аб'яўленні Падзякі (вышыня літар – 2 мм).

9. Падзяка змяшчаецца ў металічную рамку са шклом памерам 305 х 405 мм і прымацоўваецца да яе кранштэйнамі.